Алесь МАКАРЭВІЧ,
доктар філалагічных навук

# ЛІРЫЧНЫ ТВОР: ХАРАКТАРЫСТЫКА МАСТАЦКІХ ВОБРАЗАЎ

## НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЕРША "А ХТО ТАМ ІДЗЕ?" ЯНКІ КУПАЛЫ (IX КЛАС)

*Заканчэнне. Пачатак у № 7.*

Фабульны пласт верша "А хто там ідзе?" прадстаўлены складнікамі: а) быційныя факты, элементы дзеяння, эмоцыі, настрой, памкненні беларусаў; гэтыя элементы выступаюць сэнсаўтваральным элементам матывацыі сацыяльных памкненняў, якія ў сваю чаргу нараджаюць вобраз-матыў: выхаду Беларусаў як часткі "агромністай грамады" на шлях здзяйснення галоўнай экзістэнцыйнай мэты любога народа – "*людзьмі звацца*"; б) героі (Беларусы), якія рэальна існуюць у лірычнай прасторы твора; в) неабазначаны лірычны герой, які ў рэальным часе назірае і рэпрэзентуе памкненні, жаданні, намеры Беларусаў; ён – носьбіт (рэтранслятар) памкненняў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

суайчыннікаў; г) вобраз абставін шляху Беларусаў у будучыню; гэтыя абставіны ўяўляюць сабой нейкую частку прасторы, дзе здзяйсняецца шлях іншых народаў у будучыню; прычым выхад на гэты шлях іншых народаў не канкрэтызуецца яго прычынамі (як у выпадку з Беларусамі).

Такім чынам, можна акрэсліць асаблівасці лірычнага свету верша "А хто там ідзе?". Неназваны лірычны герой – беларус – агучвае грамадзянскі настрой і намер суайчыннікаў: рашуча выйсці ў прастору годнага сацыяльнага, агульначалавечага існавання. Галоўная прычына гэтага намеру – далей так існаваць немагчыма; у вершы абсалютна выразна акрэслена матывацыя грамадзянскай рашучасці Беларусаў.

Прыведзеныя вышэй абагульненні пацвярджаюцца абагульнена-сэнсавым пластом і яго складнікамі: а) вобраз-матыў – выхад беларусаў у прастору людскага – чытай, годнага як нацыі, народа – існавання; б) вобраз шляху, дарогі (шлях выхаду з экзістэнцыйнага і сацыяльнага заняпаду, шлях нацыянальнага адраджэння) – ён толькі абазначаны кантэкстам іншых вобразаў, не акрэслены ў падрабязнасцях, у сукупнасці з іншымі вобразамі фабульнага слою выводзіць рэцыпіента за межы лірычнага свету твора – адсылае да актуалізацыі яго сэнсаў, актыўна ўключаючы твор у кантэкст гістарычнай рухомасці: перачытвання яго ў сукупнасці іншых твораў паэта (напрыклад, верша "Паязджане", 1918), а таксама іншых умоў функцыянавання гэтых тэкстаў (у тым ліку і сучасных): гістарычных, сацыяльных, нацыянальных; в) вобразы-тропы.

Звернемся да больш падрабязнай характарыстыкі семантыкі вобразаў верша "А хто там ідзе?". Сама назва твора – мастацкі вобраз абагульнена-сэнсавага пласта: *вобраз-пытанне*. Яго семантыка адсылае да асэнсавання праблем, якія назіраем у іншых тэкстах пісьменніка, – "каб хоць троха лепей жыць" ("Мая доля", 1904), "смеху і пагарды", "лаянкі і крыку" ў адносінах да мужыка (верш "Мужык", 1905), "найболей мучаных", якія "спяць", а мусяць паўстаць супраць "цара з нагайкай" ("Там", 1908), наканаванасці існавання беларуса ў атачэнні злыбеднай долі, татальнай бяды, адвечных голаду і холаду, хоць само жыццё дало яму магчымасць "названне насіць – чалавек" (паэма "Адвечная песня", 1908), "услужлівасці і пакорнасці", што навязвае беларусу "нехта нейкі ў чорным" ("Пчолы і трутні", 1913).

У адносінах да творчага намеру пры стварэнні верша "А хто там ідзе?" і яго мастацкага зместу аўтар адзначыў наступнае: "Мне хацелася крыкнуць на ўвесь свет аб тым, як цяжка пакутуе народ пад прыгнётам цара і капіталістаў. Мне хацелася намаляваць вобраз народа, які ідзе з рукамі ў крывавых мазалях, з нагамі ў лапцях і нясе на плячах сваю крыўду. Мне хацелася, каб гераічны і свабодалюбівы беларускі народ знішчыў усіх сваіх крыўдзіцеляў" (з прамовы на ўрачыстым пасяджэнні, прысвечаным 35-годдзю літаратурнай творчасці Янкі Купалы) [3, с. 379–380].

Да праблемы шляху беларусаў у будучыню Купала на трагічным семантычным узроўні звярнуўся ў вершах "Паязджане" (1918), "Перад будучыняй" (1922) і інш. Пакуль жа ў грамадска-рэвалюцыйных умовах 1905 г. паэт асэнсоўваў перспектыву нацыянальна-сацыяльнага выхаду беларускага народа ў прастору, дзе ён будзе мець магчымасць *"людзьмі звацца"*.

Звернемся да характарыстыкі вобразаў фабульнага слою. Яны прадстаўлены *вобразамі ўяўлення*, што паўстаюць у свядомасці лірычнага героя, які рэпрэзентуе выхад Беларусаў на шлях да годнага жыцця ў сям'і іншых народаў. Першы з такіх вобразаў – гэта *вобраз грамады*, што знаходзіцца ў прасторы шляху, дарогі ў будучыню. Гэты шлях можна вызначыць як гістарычны і на перспектыву. Вобраз "грамада" аздабляецца эпітэтам *"агромністая"*. Грамада людзей, якая рухаецца ў адным напрамку, як правіла, – сацыяльная сукупнасць, аб'яднаная адной мэтай, адной прасторай, падобнымі формамі руху і інш. Калі яна "агромністая", то з'яўляецца той грамадскай сілай, што здольная калі неператварыць кардынальна, то змяніць прастору яе шляху. Вобраз "агромністая грамада", да якой далучыліся Беларусы, падкрэслівае магчымасць апошніх выйсці ў прастору людскага існавання.

Вобраз "Беларусы" [заўважым у параўнанні з іншымі Купалавымі вобразамі: людзі – не "дурныя мужыкі" ("Мужык"), не "цёмныя мужыкі" ("Я мужык-беларус")] паводле яго семантыкі – *вобраз-сцверджанне, вобраз-узвышэнне*. Беларусы – частка сукупнасці, грамады народаў, якая ўпэўнена рухаецца ў будучыню. Гэта частка сукупнасці, што ідзе па дарозе да людскага жыцця. Можна дапусціць, што аўтар меў на ўвазе грамаду не толькі адных беларусаў (інакш было б: 'А хто там ідзе агромністай такой грамадой?', што падкрэслівала б спосаб дзеяння, працэсу, руху), а грамаду, у якой мэтанакіравана рушыць сукупнасць народаў, што ўдзельнічалі ў рэвалюцыі 1905–1907 гг. У такім выпадку вобраз "агромністая грамада" выходзіць сваёй семантыкай не ў прастору спосабу дзеяння, а ў прастору шырыні ўдзельнікаў народнага руху і шырыні яго дзеяння: "у свеце цэлым". Гэтую выснову падмацоўвае і гістарычны аспект стварэння верша: ён напісаны ў той перыяд, калі людзі "ў моры фальшу йшлі шукаць броду": "…Цар жа бічуе, / А бедны з гора бічу не чуе. / Росціць надзею рай мець за слёзы. – / Што вясна будзе, знікнуць марозы. / І хоць за праўду гіне нявінна, / Смела йдзе ў бойку… Так быць павінна. …Цяпер жа ты цвярозы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ці ўпіўся, / Цар ёсць з табою, ва ўсё ён убіўся. / Калі ў свабодзе такой пажывецца, / То і за сонца плаціць давядзецца" ("Водклік з 29 кастрычніка 1905 г. у Мінску"* [3, с. 52–53]).

Узвышальная семантыка вобраза "Беларусы" падкрэсліваецца і замацоўваецца фінальным сцверджаннем верша: "Людзьмі звацца". Народ, што мае перад сабой такую мэту і ўпэўнена ідзе да яе здзяйснення, – гэта народ, намеры якога аздоблены высокім эстэтычна-грамадзянскім сэнсам.

Разам з тым не варта абсалютызаваць прыведзенае сцверджанне адносна семантыкі неабазначанага ў лірычнай прасторы верша выказвання яго героя, ад імя якога ўзнаўляецца паход Беларусаў у "агромністай грамадзе". Яно адноснае: спрацоўвае ў праекцыі на прастору менавіта гэтага верша. Неназваны лірычны герой тут не тоесны асобе аўтара. Прыгадаем у сувязі з гэтым фабульны свет вершаў "Там" (1906) і "Прарок" (1912). У вершы "Там" неабазначаны лірычны герой-прамоўца звяртаецца да тых, хто ў сітуацыі грамадзянскага змагання "барцоў, што на вісельні ідуць", "спіць", а мусіць паўстаць "грамадою". Тут вобраз грамады адсылае да праблемы грамадскага яднання: "А вы, вы мучаны найболей, / Спіцё, хоць вас даўно там ждуць. <…> До спаць! Паўстаньце грамадою / І йдзіце ім там памагаць, / Паўстаньце крэпасцю такою, / Каб вораг вас не мог зламаць. / Паўстаньце, покуль цар звыродны / Крыві ўсяёй не высссаў з вас! / Паўстаньце! Край ваш стогне родны, / Заве збаўляць, як зваў не раз" [3, с. 70, 71]. У "Прароку" рэпрэзентуецца прастора "зямлі забранай сумных хат, / Дзе царства цемры панавала, / Дзе сілу ўзяў над катам кат" [4, с. 84]. У фінале твора "змарнеўшы народ таго краю" на заклік Прарока пайсці за ім "на волю" адказвае яму трагічна-абразлівым "не": "Так гаварыў і з рабства клікаў / Людзей на волю той прарок, / Ждучы з трывогаю вялікай / Ад іх адказу неўнарок. // А людзі, глянуўшы на сонца, / Адказ казалі грамадой: / – Пакольki ж нам дасі чырвонцаў, / Калі мы пойдзем за табой?" [4, с. 85].

У праекцыі на прыведзеныя супастаўленні можа з'явіцца пытанне: які іх сэнс для практыкі школьнага выкладання літаратуры ў IX класе, калі вывучэнне цытаваных вершаў не прадугледжваецца на дадзеным этапе літаратурнай адукацыі? Адказ можа быць двухпланавым. Па-першае, падобныя паралелі і супастаўленні настаўнік заўсёды павінен мець на ўвазе, што дазваляе мадэляваць і праводзіць адпаведную навучальную і выхаваўчую дзейнасць па характарыстыцы канкрэтнага твора больш аб'ёмна: у гістарычнай, грамадзянскай, нацыянальнай і эстэтычнай праекцыі на іншую вобразную прастору ў полі аўтарскай творчасці з пазіцыі гістарычнай рухомасці мастацкага твора. Па-другое, IX клас – гэта той этап літаратурнай адукацыі (з пазіцыі ўзроставых асаблівасцей вучняў, іх сацыяльнага вопыту, грамадзянскіх, нацыянальных, псіхалагічных установак), які дазваляе паступова выходзіць на аналіз мастацкага тэксту ў супастаўленні яго з іншымі творамі і літаратурнымі з'явамі, з улікам розных эстэтычных праяў у творчасці пісьменніка. Такі падыход спрыяе больш шырокаму выяўленню сэнсу мастацкага твора: у сацыяльна, эстэтычна пазнавальных адносінах і падмацоўвае палажэнне пра чалавеказнаўчую ролю вывучэння літаратуры: вучыць супастаўляльнаму мысленню, фарміраванню грамадзянскай пазіцыі, жыццю пры дапамозе літаратуры.

У другой страфе верша "А хто там ідзе?" прадстаўлены метафарычныя вобразы спосабу дзеяння да папярэдняга вобраза "Беларусаў" – яны "нясуць крыўду": "на худых плячах", "на руках у крыві" (акрываўленых руках), "на нагах у лапцях". Вобразы маюць ключавыя і ўзмацняльныя складнікі: *плечы* + эпітэт *худыя*, *рукі* + эпітэт *у крыві* (акрываўленыя), *ногі* + эпітэт *у лапцях* (*лапатныя* – без зніжанай семантыкі**). У гэтай страфе фігуруе збіральны вобраз абсалютна спрацаванага і спакутаванага чалавека.

Не заглыбляючыся ў сферу лінгвістычных даследаванняў, звязаную з вывучэннем фразеалагізмаў з саматычным кампанентам***, заўважым, што ў вобразным кантэксце дадзенага верша вызначаныя вышэй вобразныя складнікі – сукупнасць аўтарскіх фразеалагізмаў з саматычным кампанентам, якая выконвае сэнсаўтваральную ролю ва ўсім тэксце, а не толькі ў межах дадзенай страфы. Праілюструем гэтую выснову. Выраз *несці на плячах* мае вобразна не афарбаваную семантыку: 'несці нешта цяжкае, груваcткае, тое, што нязручна пераносіць на

---

* Укладальнікі 1-га тома Збору твораў Я. Купалы ў 9 тамах вызначаюць год напісання верша як 1905-ы. "Рабочыя ўдзельнічалі ў Кастрычніцкай усерасійскай стачцы 1905 г. 18 кастр. У Мінску… адбыўся 10-тысячны мітынг, дзе сацыял-дэмакраты заклікалі не верыць цару, які 17 кастр. выдаў маніфест, і прадаўжаць барацьбу супраць самадзяржаўя. Па патрабаванні ўдзельнікаў мітынгу генерал-губернатар П. Курлоў вымушаны быў вызваліць палітвязняў. Аднак у гэты час па загадзе губернатара салдаты акружылі плошчу і без папярэджання пачалі страляць па дэманстрантах. Было забіта больш за 80 чалавек і некалькі сотень паранена. Пахаванне забітых ператварылася ў антыўрадавую дэманстрацыю, якая адбылася 29 кастр. 1905 г." [3, с. 345].

** Параўнаем: у Купалы "лапатнік" – гэта 'чалавек, які знясілены цяжкай, пакутлівай працай, жыве ў беднасці і нястачы', але і "корміць" сваіх прыгнятальнікаў: "З імі [лапцямі] шануйце / Цяжкую працу, – / Лапатнік корміць / Пана з палацу" ("Лапці", 1905–1907) [3, с. 237].

*** Фразеалагізмы з саматычным складнікам здольныя перадаць праяўленне духоўнага і фізічнага жыцця пры дапамозе лексем, якія вобразна абазначаюць жыццёвыя працэсы, якасці, псіхічны і фізічны стан чалавека праз успрыманне, фіксаванне і частковую яго ацэнку слыхам, зрокам, пэўнымі часткамі цела.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

(у) руках'. Істотным тут з'яўляецца вобраз дзеяння "нясуць", які мае сэнс 'вынесці, выдаліць з прасторы існавання'; у дадзеным выпадку – крыўду, а значыць, і яе вытокі, і ўласны стан, выкліканы гэтай крыўдай, а таксама ўмовы, што ўсё гэта нараджаюць. Параўнаем: у народных выслоўях – *гэта ўсё ляжа на мае плечы*. У Купалы выраз *несці на плячах* семантычна спалучаецца з эпітэтам *худыя*, што высвятляе наступны сэнс: у грамадзе з'ядналіся беларусы, абсалютна спрацаваныя, фізічна знясіленыя.

Выслоўе *рукі ў мазалях* у традыцыйным разуменні мае не толькі канстатацыйнае значэнне фізічнага стану часткі цела, але і абагульняльнае: працаваць далей немагчыма, бо ранейшая доўгая праца такую магчымасць перакрэсліла. У Купалавым вобразе "*нясуць (крыўду) на руках у крыві*" чытаецца наступнае: 'на руках, якія ў крывавых мазалях'. У такім выпадку вызначаная семантыка папярэдняга вобраза (фізічныя сілы мінімалізаваныя) узмацняецца семантыкай максімалізацыі: людзі абсалютна не могуць працаваць; дададзім – знікае магчымасць нармальнага фізічнага існавання. Тут паказальна, што прапанаваная семантыка, звязаная з фізічным існаваннем герояў верша, дапаўняецца іншай пры дапамозе галоўнай іх мэты – "*людзьмі звацца*" – семантыкай духоўнай, грамадзянскай, эстэтычнай сферы.

"Нясуць (крыўду) на нагах у лапцях" – гэты метафарычны вобраз фабульнай сферы таксама можна аднесці да аўтарскага фразеалагізма з саматычным кампанентам. Устойлівую семантыку вобраза* можна прасачыць на прыкладзе адной з частак верша "Лапці" Я. Купалы: "Будзе ён [лапаць] сведчыць, / Як у няволі / Кепска жывецца / Ў хаце і ў полі. // Як людзей сотні / Лапці цягалі, / Каб багачы ўсе / Ў золаце спалі" [3, с. 237].

Семантыка прыведзенага вобраза ўзмацняецца саматычным кампанентам 'ногі' з верша "А хто там ідзе?". Лексічнае значэнне слова *ногі* адсылае да працэсу доўгага, функцыянальна важнага дзеяння ў прасторы існавання чалавека. Суаднясём такое значэнне з ключавой семантыкай наступных фразеалагізмаў з мэтай вылучэння метафарычнага сэнсу вобраза "несці крыўду на нагах у лапцях": *адхадзіць ногі* – стаміцца, змарыцца ад хады; *валіцца / падаць з ног* – не мець сіл ад стомленасці; *выбіць глебу / грунт з-пад ног* – пазбавіць упэўненасці ў чым-н.; *збіцца з ног* – стаміцца, змучыцца ад клопатаў, беганіны; *зваліцца з ног* – знемагчыся, злегчы ад хваробы, працы, гора; *ледзь дацягнуць ногі* – з цяжкасцю дайсці; *ледзь ногі носяць* – аб вялікай стомленасці або слабасці; *ледзь трымацца на нагах* – не магчы хадзіць, стаяць па прычыне слабасці; *ногі не нясуць* – няма сілы ісці, рухацца; *ногі не трымаюць* – аб моцнай стомленасці або дрэнным адчуванні; *ног не чуць пад сабой* – адно са значэнняў – вельмі стаміцца [12].

Прымаючы пад увагу складнік "ногі ў лапцях" у вобразе "Беларусы нясуць крыўду на нагах у лапцях" з верша "А хто там ідзе?", а таксама вобраз "людзей сотні", што "лапці цягалі" з верша "Лапці", прыходзім да высновы: прастора пабытавага, жыццёвага функцыянавання "ног у лапцях" неспрыяльная для іх хады ў гэтай прасторы – яны стомленыя, пазбаўленыя ўпэўненасці, у іх няма сілы рухацца і іншае (любы з прыведзеных фразеалагізмаў падыходзіць да гэтага вобраза). Вобраз "крыўда" ў другой страфе – гэта вобраз-канстатацыя прычыны намеру і звязанага з ім дзеяння: крыўда ('несправядлівыя ўчынкі, паводзіны ў дачыненні да каго-н., якія абражаюць, засмучаюць' [12]) пабудзіла ўзысці на гэты шлях. Такім чынам, на падставе вобразаў другой страфы верша "А хто там ідзе?" можна зрабіць высновы: фабульны свет твора – гэта прастора абсалютнай сацыяльнай беспрасветнасці, цяжкасці і непрыдатнасці існавання для яе герояў; яны – Беларусы – шукаюць выйсця з яе, імкнуцца ў іншую, больш спрыяльную для іх жыцця прастору існавання (фізічнага, душэўнага, духоўнага – людскага).

У трэцяй страфе верша праблема выйсця ў іншую прастору высвечваецца фабульнымі вобразамі мэты дзеяння "нясуць крыўду напаказ" "на цэлы свет". Супаставім лексічныя складнікі гэтых вобразаў з семантыкай слова *напаказ* у першым і другім яго значэнні – 'для агульнага агляду' 'з мэтай звярнуць увагу' [12]. Беларусы ў дадзеным выпадку імкнуцца несправядлівасць, абразу, смутак – крыўду – іх сацыяльнага становішча агучыць у больш шырокай сацыяльнай прасторы з мэтай канстатацыі іх права на пратэст, барацьбу, а праз вынікі змагання далучыцца да гэтай сацыяльнай прасторы як роўныя сярод роўных.

Неназваны лірычны герой верша звяртае ўвагу на яшчэ адну прычыну і яшчэ адзін выток намераў Беларусаў з грамады: "бяда, гора навучылі крыўду несці". Семантыка слова *навучылі* тут адсылае да праблемы пратэсту супраць доўгага (паводле часу і стану) існавання ў прасторы сацыяльных 'бяды і гора'.

Супаставім дадзены вобраз са значэннямі слова *навучыць* і найперш з другім з іх, якое адносіцца да сферы размоўнай лексікі: 'падвучыць, падгаварыць зрабіць што-н.' [12]. Іншыя значэнні гэтага слова: 'даць параду, указанне', 'прымусіць зразумець што-н., пераканаць у чым-н.' [12]. Такое супастаўленне дае падставы для сцверджання ў адносінах да вылучаных вышэй вобразаў. "Бяда" і "гора" – вобразы, якія ў дадзеным выпадку

---

*Семантыка і канатацыі лексемы *лапці* ў Купалавых вершах разглядаюцца ў артыкуле А. Багдзевіча, С. Ляскевіч [2].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ажываюць, на што, акрамя іншага, указвае займеннік *хто* (прынцып антрапамарфізму і прыём адухаўлення – уласцівасці жывых істот пераносяцца ў дадзеным выпадку на абстрактныя паняцці; тут можна параўнаць гэтыя вобразы з вобразамі "Доля", "Бяда", "Голад", "Холад" з Купалавай паэмы "Адвечная песня"). Вобраз "бяда, гора" выконвае функцыю вытокаў фабульнага дзеяння збіральнага лірычнага героя (Беларусы): 'галеча, нястача, недахоп сродкаў для жыцця' – бяда [12], 'стан глыбокага смутку, душэўнага болю', 'жыццёвыя нягоды, мукі, нястача' [12], выкліканыя бядой існавання. Акрамя таго, акрэсленыя з'явы выступаюць прычынай выхаду Беларусаў са стану сацыяльнага сну, стану слепаты і глухасці (вобразы наступнай страфы).

Эпітэты *пагарджаныя*, *сляпыя*, *глухія* з апошняй страфы верша выконваюць функцыю сэнсавага ўзмацнення ў адносінах да вылучаных вобразаў папярэдняй часткі верша. Асабліва гэтае ўзмацненне праецыруецца на вобраз "сон". Стан сацыяльнага сну Беларусаў з верша "А хто там ідзе?" выкліканы, акрамя іншага, і векавой пагардай ("пагарджаны век") у адносінах да іх.

Фінальнае сцверджанне верша – *"Людзьмі звацца"* – можна разглядаць як вобраз сцвярджальнага ўяўлення, вобраз мэты. Сэнс гэтага вобразнага ўяўлення мэты і яе сцвярджэння – замацаванне ў свеце ў якасці паўнавартаснай нацыі са сваімі трывалымі сацыяльнымі, этнічнымі і палітычнымі правамі і магчымасцямі.

Верш "А хто там ідзе?" вызначаўся як "народны гімн беларусаў" (М. Горкі), "верш-гімн беларускага народа" (Л. Гіра), як твор, "набліжаны да нацыянальнага гімна" (В. Рагойша) і інш. «У 1910 г. віленскі кампазітар Л<юдамір> Рагоўскі паклаў верш на музыку, і яго як неафіцыйны гімн выконвалі розныя беларускія суполкі да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г., а ў Заходняй Беларусі – да 1939 г. Верш Я. Купалы з нотамі Л. М. Рагоўскага газ<ета> "Наша Ніва" надрукавала асобнай лістоўкай (Вільня, 1910) на беларускай мове і лацінкай. Верш Купалы з нотамі Л. М. Рагоўскага быў надрукаваны таксама ў "Беларускім календары «Нашай Нівы»" на 1910 г.» [3, с. 379].

Аднясенне верша "А хто там ідзе?" да вершагімна, думаецца, абумоўлена найперш мэтай Беларусаў (у фабульнай прасторы верша) выйсці на шлях барацьбы за права на годнае існаванне ў свеце, у якім ім пакуль што няма месца як роўным сярод роўных, як народу, нацыі з поўным правам і магчымасцямі на гэтае годнае жыццё. Твор успрымаецца як праслаўленне (паказальная якасць гімну) імкнення Беларусаў *"людзьмі звацца"*.

Верш "А хто там ідзе?" адносіцца да твораў Янкі Купалы, якія вызначаюцца выключнай гістарычнай рухомасцю праблематыкі, фабульных вобразаў, нацыянальнай ідэі ў цэлым. Такая асаблівасць вымагае выключнай увагі ў адносінах да вобразнай яго характарыстыкі і супастаўлення з іншымі творамі. Прапанаваны падыход да гутаркі па гэтым вершы ў IX класе з'яўляецца адным з варыянтаў яго вывучэння. Формы абмеркавання могуць быць рознымі: а) тлумачэнне настаўніка, б) рэфератыўныя паведамленні вучняў у адпаведнасці з апераджальнымі заданнямі, распрацаванымі настаўнікам (іх мэта – выяўленне асаблівасцей сэнсавага напаўнення вобразаў), в) прэзентацыя, падрыхтаваная вучнямі пад кіраўніцтвам настаўніка, на тэму «Асаблівасці фабульнай і вобразнай прасторы верша "А хто там ідзе?"» і інш.

### Спіс літаратуры


1. **Вучэбная праграма** па вучэбным прадмеце "Беларуская літаратура" для IX класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання і выхавання [Электронны рэсурс] / Зацв. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь 29.07.2019. – Рэжым доступу: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2021-2022-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2021-2022/304-uchebnye-predmety-v-xi-klassy-2020-2021/3802-belaruskaya-l-taratura.html. – Дата доступу: 10.06.2022.

2. **Багдзевіч, А. І.** Семантычна-культуралагічны аспект перакладу лексемы "лапці" ў паэзіі Янкі Купалы / А. І. Багдзевіч, С. Г. Ляскевіч // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні : зб. навук. прац. – Гродна : ТАА ЮрСаПрынт, 2013. – С. 168–173.

3. **Купала, Я.** Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : 1995–2002. – Т. 1. – 462 с.

4. **Купала, Я.** Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала. – Мінск : 1995 – 2002. – Т. 3. – 342 с.

5. **Макарэвіч, А.** Вобразы Данілкі і Зосі з драмы "Раскіданае гняздо" ў кантэксце сэнсавых асаблівасцей спадчыны Янкі Купалы і драм Ф. Аляхновіча / А. Макарэвіч // Роднае слова. – 2003. – № 3. – С. 18–23.

6. **Макарэвіч, А. М.** Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры : Урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах / А. М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 7. – С. 9–16.

7. **Макарэвіч, А. М.** Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры : Урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў V–VI класах / А. М. Макарэвіч // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 8. – С. 21–30.

8. **Макарэвіч, А. М.** "Тугой спавіта вышыня...": Сэнсаўтваральныя асаблівасці вобразнай сістэмы зборніка "Строма" У. Дубоўкі : манаграфія / А. М. Макарэвіч. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2019. – 160 с.

9. **Макарэвіч, А. М.** Асаблівасці вывучэння лірыкі Уладзіміра Дубоўкі ў 10 класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / А. М. Макарэвіч // Мова, літаратура і культура ў адукацыйнай прасторы Беларусі і Кітая : зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск : РІВШ, 2020. – С. 150–154.

10. **Макарэвіч, А.** Сістэма перспектыўных ліній пры характарыстыцы мастацкіх вобразаў лірычнага твора : На прыкладзе вершаў Максіма Багдановіча і Анатоля Грачанікава (V клас) / А. Макарэвіч // Роднае слова. – 2021. – № 11. – С. 66–70.

11. **Рагойша, В.** Мой Трыглаў : Кніга пра Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча / В. Рагойша. – Мінск : Кнігазбор, 2012. – 340 с.

12. **Скарнік** [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.skarnik.by. – Дата доступу: 12.06.2022.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова